## ПАСЯДЖЭННЕ ДРУГОЕ

*Ранішняе, 15 студзеня 1935 г.*

Старшыня—тав. **А. Г. Чэрвякоў**

**Старшыня.** Другое пасяджэнне XI Усебеларускага З'езда Советаў абвяшчаю адчыненым.

У парадку дня—справаздача Ўрада БССР.

Слова для даклада мае Старшыня СНК БССР тав. Галадзед. (апладысменты, пераходзячыя ў авацыю).

**Галадзед.** Таварышы, ад X да XI з'езда советаў прайшло 4 гады. За гэты тэрмін Совецкі Саюз у цэлым, а пад яго кіраўніцтвам і ўсё саюзныя нацыянальныя рэспублікі прайшлі вялікі гістарычны этап па шляху ўздыму соцыялізма.

За гэты час партыя і ўрад прарабілі гіганцкую работу. За гэты перыяд адбыліся вялікія соцыяльна-эканамічныя зрухі ў нашай краіне Советаў. Але разам з гіганцкімі дасягненнямі не так даўно нашу дзяржаву пасцігла вялікае няшчасце. Партыя, совецкая ўлада, пролетарыят панеслі вялікую ўтрату. Класавы вораг, подлыя падонкі контррэволюцыйнай зіноўеўска-трацкісцкай апазіцыі забілі лепшага сына нашай радзімы, палкага большэвіка-рэволюцыянера—таварыша Кірава. Гэта амрачыла нашы дасягненні, бо пры іх падвядзенні мы не маем у нашых радах аднаго з выдатных правадыроў рабочага класа і нашай партыі, які працаваў над гэтымі дасягненнямі. Але наша партыя, нашы советы тым і моцны, што яны заўсёды, пры любых стратах не апускаюць рук, не трацяць перспектыў, не трацяць сваёй энергіі, пільнасці, а з яшчэ большай энергіяй прадаўжаюць справу Леніна—Сталіна. У адказ на забойства тав. Кірава ўзнімаюцца новыя мільёны барацьбітоў за соцыялізм.

За гэты час мы мелі нямала падзей і на міжнароднай арэне. Многа актаў і пактаў заключыў Совецкі Саюз з рознымі краінымі, якія (акты і пакты) накіраваны на справу ўмацавання міру. За гэты час наш Совецкі Саюз выйшаў на арэну міжнароднай палітыкі, як самы магутны фактар барацьбы за мір.

Наша мірнае соцыялістычнае будаўніцтва мы не можам адарваць ад той міжнароднай абстаноўкі, у якой нам прыходзілася працаваць і якую мы павінны былі ўлічваць ва ўсіх прак-

тычных пытаннях нашай унутранай палітыкі і практыкі. Таму мне хацелася-б, таварышы, перш чым прыступіць да падвядзення вынікаў работы рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, а таксама і работы ўрада за гэты адчотны перыяд, спыніцца кораценька на пакaзе той міжнароднай абстаноўкі, у якой праводзілася наша работа.

---

I

# АБ МІЖНАРОДНЫМ СТАНОВІШЧЫ

## 1. Эканамічны крызіс капіталістычных краін

Амаль год таму назад тав. Сталін у сваім дакладзе на XVII партыйным з'ездзе нарысаваў параўнальную карціну становішча СССР перад тварам капіталістычнага свету. Год, які аддзяляе нас ад з'езда партыі, цалкам і поўнасцю пацвердзіў ва ўсіх адносінах абсалютную правільнасць характарыстыкі міжнароднага становішча, якая была дана нашым правадыром.

З 1929 г. капіталістычны свет б'ецца ў цісках крызіса, але і да гэтага часу не можа дабіцца колькі-небудзь рашаючых зрухаў у бок выхаду з гэтага крызіса.

У 1932 г. у развіцці сусветнага эканамічнага крызіса адбыўся некаторы перапом у бок дэпрэсіі. У многіх капіталістычных дзяржавах вызначылася некаторае палепшанне. Індэкс развіцця капіталістычнай гаспадаркі пайшоў нібы ўверх. Сусветная буржуазія расцаніла гэтае першае палепшанне, як прызнак хуткага выхаду з крызіса. Але 1933—34 гг. паказалі, як абманчывы былі гэтыя надзеі буржуазіі; гэтыя гады яшчэ раз пацвердзілі словы тав. Сталіна, што мы маем дэпрэсію асобага роду, за якой зусім не відны перспектывы сапраўднага ўздыму і росквіту прамысловасці буржуазных краін. Росквіту гэтага і не можа быць, бо сучасны крызіс капіталістычнай эканомікі разгарнуўся і адбываецца на аснове ўсеагульнага крызіса капіталізма ў перыяд яго загнівання і заняпаду.

Буржуазія, як гэта паказаў вопыт апошніх двух год, шляхам палітыкі зніжэння зарплаты, шалёнай эксплаатацыі пралетарыята, аграблення сялянскіх мас і каланіяльных народаў, здолела дабіцца некаторага палепшання. Але яна не здольна стварыць умоў для нармальнага развіцця вытворчых сіл. Шляхам шалёнай падрыхтоўкі да вайны і гонкі ўзброенняў, патрабуючых мільярдных укладанняў дзяржавы ў прамысловасць, занятую вырабам прылад і сродкаў вайны, буржуазным урадам некаторых краін, як напрыклад Японіі і Германіі, удалося нават дабіцца вядомых поспехаў у вобласці цяжкай прамысловасці. Але гэты ўздым, па-першае, ішоў за кошт развіцця ваеннай прамысловасці, па-другое, ён дасягнут цаною расходвання на ваенную

прамысловасць велізарных грашовых сродкаў, сабраных за кошт неміласэрдна абкладзеных народных мас. Гэтым па сутнасці паскоран выбух новай імперыялістычнай бойні. Уздым, які вызначыўся ў паасобных галінах гаспадаркі капіталістычных краін, не можа стаць выходным пунктам колькі-небудзь працяглага і грунтоўнага развіцця сусветнай гаспадаркі. Таму не выпадкова, што гаспадарчая кан'юнктура капіталістычных краін, штучна падтрымліваемая капіталаўкладаннямі з боку ўрадаў за кошт дзяржавы, падвяргалася ў апошнія пару год вялікім ваганням—то ўздыму скачкамі ўверх, то зноў скачкамі апускання ўніз.

Гэта відаць з наступнага: індэкс сусветнай прамысловай прадукцыі, які дасягнуў у красавіку 1934 г. 82 пунктаў супроць 100 1928 г. (узровень індэкса прадукцыі ў 1928 г. мы бярэм за 100), пачынаючы з вясны 1934 г., сістэматычна апускаецца ўніз і ў снежні 1934 г. зніжаецца да 70 пунктаў узроўню 1928 г. Вось табліца, якая ярка паказвае ход дэпрэсіі «асобага роду», характарызуючай становішча капіталістычнай гаспадаркі:

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

| | Індэкс прамысловай прадукцыі 1928 г. 100 | У млн. тон у месяц | | Здабыча вугалю | Сусветны знешні гандаль 1928 г.—100 |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Выплаўка чыгуну | Прадукцыя сталі | | |
| Ніжэйшы пункт крызіса ў 1932 г. . . . . | 62 | 2,3 | 3,2 | 58 | 33 |
| 1933 г. кастрычнік . . | 79 | 3,8 | 5,4 | 79 | 39 |
| 1934 г. май . . . . | 83 | 5,0 | 7,2 | 77 | 35 |
| 1934 г. чэрвень . . . | 81 | 4,8 | 6,8 | 73 | 35 |
| 1934 г. ліпень . . . | 77 | 4,1 | 5,2 | 71 | 33 |
| 1934 г. жнівень . . . | 75 | 4,0 | 5,1 | 75 | 34 |
| 1934 г. верасень . . . | 73 | 3,8 | 4,9 | 76 | 36 |
| 1934 г. кастрычнік . . | 74 | 4,0 | 5,5 | 80 | 37 |
| 1934 г. снежань . . . | 70 | — | — | — | — |

Такім чынам, агульны ўздым прамысловай вытворчасці капіталістычных краін праз два гады з моманту вызначэння пералому ў бок дэпрэсіі ўсё-ж яшчэ на 30% ніжэй дакрызіснага 1928 г., а па асобных галінах прамысловасці не дасягнуў нават і 70%. Па чыгуну, сталі, здабычы вугалю капіталістычная гаспадарка не дайшла яшчэ да 50% узроўню 1928 года.

і гэта ў той час, калі СССР павялічыў сваю прадукцыю ўжо ў 1933 г. у параўнанні з 1929 г. на 201,5% і ў мінулым 1934 г. даў новы прырост прамысловай прадукцыі на 19%.

Такім чынам праз 5 год пасля пачатку сусветнага эканамічнага крызіса і праз 2 гады пасля таго, як крызіс дасягнуў ніжэйшага пункту, сусветная капіталістычная гаспадарка яшчэ знаходзіцца на надзвычай нізкім узроўні.

Гаспадарчае становішча паасобных капіталістычных краін пры гэтым неаднолькавае. Толькі адна Японія здолела, у сувязі з ліхарадачным разгортваннем прамысловасці, працуючай на вайну, перакрыць дакрызісны ўзровень прамысловай прадукцыі.

У Англіі прамысловая прадукцыя на 16% ніжэй дакрызіснага ўзроўню 1928 г.; у Германіі—на 22%, у Францыі—на 33%, у Польшчы—на 36%, у Злучаных Штатах Амерыкі—на 46%. Галоўныя капіталістычныя краіны, як Англія, Францыя, Германія, па ўзроўню сваёй прамысловай прадукцыі, знаходзяцца ў сучасны момант ніжэй даваеннага ўзроўню ў той час, як прамысловасць СССР ужо перавысіла даваенны ўзровень больш, чым у чатыры разы.

У сельскай гаспадарцы капіталістычных краін справа абстаіць яшчэ горш. Неўраджай у многіх краінах у 1934 г., які даваў надзею капіталістам, прывёў да яшчэ большага скарачэння сельскіх даходаў.

Разбураюцца мільёны сялянскіх гаспадарак, масы нішчаюць і толькі невялікая верхавінка фермераў і кулакоў трымаецца пры садзейнічанні ўрадаў.

Значыць, у сельскай гаспадарцы да гэтага часу няма ніякіх прызнакаў дэпрэсіі, а крызіс прадаўжаецца.

Характэрным выражэннем сусветнага крызіса астаецца да гэтага часу масавае беспрацоўе, якое вылічваецца ва ўсім капіталістычным свеце дзесяткамі мільёнаў. Прывяду некаторыя даныя з афіцыяльных крыніц капіталістычных дзяржаў аб беспрацоўі.

Напрыклад, у ЗША лік беспрацоўных складае 12 млн. чалавек, у Англіі (паўтараю, па афіцыяльных даных)—звыш 2 млн. чал., а ў паасобных галінах англійскай вытворчасці процант беспрацоўя дасягнуў страшэнных лічбаў. Напрыклад, у суднабудаўніцтве беспрацоўе складае ў канцы 1934 г. 44%, у каменнавугальнай—25% і т. д. У Германіі па афіцыяльных даных лік беспрацоўных складае 3 млн. чал., у Францыі—400 тыс. чал., у Японіі—400 тыс. чал. У Польшчы афіцыяльна зарэгістраваных беспрацоўных у снежні 1934 г. каля 400 тыс. чал., але па заяве «Газеты варшаўскай» агульная колькасць фактычных беспрацоўных вышэй 1 млн. чал. Такім чынам беспрацоўе ў капіталістычных краінах стала такой хранічнай з'явай, што агромныя мільёны людзей пачынаюць забываць, што яны калі-небудзь працавалі. Беспрацоўе ахватвае пры

гэтым не толькі асоб фізічнай працы, але самыя шырокія слаі высокакваліфікаванай інтэлігенцыі.

Гэтымі днямі мы чыталі ў адным, можна сказаць, умераным буржуазна-кансерватыўным органе, які выдаецца ў Парыжы, «Эко-дэ-пары» артыкул, прысвечаны бязвыхаднаму становішчу французскай інтэлігенцыі У гэтым артыкуле генеральны сакратар Парыжскага універсітэцкага статыстычнага бюро піша наступнае:

> «Ці патрэбна занава паўтарацца, што інжынеры ваенных і першых пасляваенных выпускаў, разглядаюцца ўжо як прастарэлыя і таму свядома прыносяцца ў афяру. Ці патрэбна паўтарацца, што інжынеры больш позніх выпускаў пасляваеннага перыяду, якія не маюць работы, зразумеюць як многа траціць з дня ў дзень іх дыплом у сэнсе камерцыйнай вартасці, ідучы на ўсе ўступкі для таго, каб не далучацца да масы сваіх старэйшых субратоў.
>
> Ці трэба паўтарацца, што лёс асоб, скончыўшых літаратурны факультэт, якім мы не можам прадаставіць месц нават малодшых выкладчыкаў, таксама як і лёс скончыўшых юрыстаў з'яўляецца не больш завідным. Архітэктары, мастакі і артысты таксама не могуць мець ніякіх надзей пакуль не знікне крызіс. Усе яны сталі беспрацоўнымі яшчэ не прыступіўшы да работы».

Гэта пішацца ў Францыі аб французскай інтэлігенцыі. Але не трэба забываць, што Францыя знаходзіцца ў лепшых гаспадарчых умовах, чым многія іншыя капіталістычныя краіны. Значыць, у іншых краінах становішча з прымяненнем разумовай працы яшчэ горшае. Не выпадкова, значыцца, буржуазныя тэарэтыкі некаторых краін выстаўляюць лозунг—«Назад ад трактара да сахі і ад машын да ручной працы»—і гавораць, што прычынай крызіса з'яўляецца машына і высокая тэхніка.

## Аб унутраных супярэчнасцях капіталістычных краін

Крызіс з'яўляецца тым фонам, на аснове якога развівалася ў апошнія гады ўнутраная і знешняя палітыка капіталістычных краін. Буржуазія імкнецца ўзваліць іздзержкі, выкліканыя крызісам, на плечы рабочых і сялянскіх мас. Практычна гэта выражаецца ў бесперапынным і бясконцым зніжэнні зарплаты, зніжэнні цэн на прадукцыю сялянскай працы (сельскагаспадарчыя тавары) і надзвычайным узмацненні падатковага прэсу, асабліва на сялянства. Каб праводзіць такую палітыку, буржуазія вымушана звяртацца да самых надзвычайных мер. Там, дзе ашуканствам і абдурваннем мас метадамі соцыял-дэмакратыі і ўсякімі «дэмакратычнымі» прыкрыццямі яна аказваецца не ў сілах перамагчы вастрыню класавых баёў і змякчыць пагрозу пралетар-

скай рэвалюцыі, там пускаецца ў ход фашысцкая дыктатура, галоўнейшай задачай якой з'яўляецца абяскровіць пралетарыят шляхам зніштажэння яго перадавога комуністычнага авангарда, разграміць класава-рэвалюцыйныя, профсаюзныя арганізацыі і зніштожыць той мінімум дэмакратычных свабод, якіх дабіваўся класава-свядомы пролетарыят. Фашызм, як сказаў аб гэтым тав. Сталін, стаў модным таварам сярод ваяўнічых буржуазных палітыкаў.

У пачатку 1933 г. устанавілася фашысцкая дыктатура ў Германіі. Прыкладу нямецкай буржуазіі імкнуцца следваць капіталісты і іншых краін.

У маі 1934 г. адбыўся фашысцкі пераварот у Латвіі; у лютым 1933 г. аўстрыйская буржуазія, разграміўшы паўстанне венскага пролетарыята, устанавіла падоб'е фашысцкай дыктатуры ў Аўстрыі. Імкненне ўстанаўлення фашысцкай дыктатуры мела месца і ў іншых дзяржавах, у прыватнасці ў Японіі, Літве і інш. Аднак, падзеі, якія адбыліся ў Германіі 30 чэрвеня 1934 г., калі па загаду фашысцкага важака былі расстрэлены галоўны начальнік арміі фашысцкіх штурмавікоў Рэм і яго аднакашнікі, таксама і тыя падзеі, якія цяпер адбываюцца ў Германіі, паказваюць, як мала здолен фашызм вырাтаваць Германію ад надыходзячага краху.

Аб гэтым тав. Сталін у свой час сказаў:

«... перамогу фашызма ў Германіі трэба разглядаць не толькі як прызнак слабасці рабочага класа і рэзультат здрад соцыял-дэмакратыі рабочаму класу, расчысціўшай дарогу фашызму. Яе трэба разглядаць таксама, як прызнак слабасці буржуазіі, як прызнак таго, што буржуазія ўжо не ў сілах уладарыць старымі метадамі парламентарызма і буржуазнай дэмакратыі, з прычыны чаго яна вымушана звярнуцца ва ўнутранай палітыцы да тэрарыстычных метадаў кіравання».

Апошні год на ўсе сто процантаў пацвердзіў прагноз тав. Сталіна, бо такога тэрарыстычнага метаду кіравання, як у Германіі, свет яшчэ не бачыў.

Але і тэрарыстычныя фашысцкія метады не могуць, аднак, выратаваць становішча. Гэта відаць з таго, што цяпер мы наглядаем крызіс фашызма ў Германіі.

У той-жа час апошні год паказаў нам, што там, дзе рабочы клас здолен проціпаставіць фашызму магутны адзіны фронт на платформе праграмы комуністычных партый, там імкненні ўстанаўлення фашысцкай дыктатуры асуджаны на немінучы правал. Там рэвалюцыйны рабочы клас кансалідуецца, адказвае на фашысцкія путчы масавымі забастоўкамі і рэвалюцыйнымі выбухамі, што мы і наглядаем у цэлым радзе буржуазных краін за апошні час.

Так прыкладна абстаіць справа з унутранымі соцыяльна-эканамічнымі супярэчнасцямі ў многіх капіталістычных краінах.

## Аб знешніх супярэчнасцях капіталістычных краін

Як вам вядома, перыяд да X з'езда саветаў БССР у міжнароднай палітыцы характарызаваўся імкненнем капіталістычных дзяржаў Еўропы прымірыць Германію з Версальскай сістэмай і ўцягнуць яе ў агульны процісовецкі блок, каб падмацаваць магутнасць агульна-еўрапейскага блоку дзяржаў супроць СССР.

Такая ідэя была найбольш ярка адлюстравана ў брыянаўскім плане ўтварэння так званай «пан-Еўропы». Магутны рост Саюза ССР у эканамічных адносінах, наша палітыка міру з аднаго боку, з другога—сусветны эканамічны крызіс нанеслі руйнуючы ўдар планам імперыялістаў па стварэнню адзінага процісовецкага блоку, а крызіс яшчэ больш абвастрыў супярэчнасці ў капіталістычным лагеры.

Перамога фашызма ў паасобных краінах яшчэ больш паглыбіла гэтыя супярэчнасці, выставіўшы вайну, як метад безадкладнага выхаду з існуючага становішча.

На гэтым фоне ўтварылася перагрупоўка і новае размежаванне сіл у капіталістычным свеце.

У міжнароднай палітыцы сёнешняга дня, якая складваецца ва ўмовах сусветнага эканамічнага крызіса, выяўляюцца дзве асноўныя лініі, якім адпавядаюць і дзве групы буржуазных дзяржаў.

Першая група буржуазных дзяржаў—гэта Германія, Японія і інш., імкненні якіх накіраваны на новы перадзел свету, на развязванне новых войн.

Другая група буржуазных дзяржаў—гэта тыя дзяржавы, у якіх, у сувязі з цэлым радам прычын, можна наглядаць тэндэнцыі да захавання міру, якія не могуць нічога выйграць, а толькі прайграюць ад новых войн. Такія тэндэнцыі ў першую чаргу праяўляюць Францыя, дзяржавы Малой Антанты, большасць прыбалтыйскіх і скандынаўскіх дзяржаў.

Японскі імперыялізм з 1931 г. вядзе настойлівую барацьбу за поўнае падначаленне сваёй уладзе неабсяжнай тэрыторыі Кітая. Умацаваўшыся ў Манчжурыі, японскі імперыялізм упарта прасоўваецца на паўночны Кітай. Дабіваючыся перавагі ў свой бок на Ціхім акіяне, Японія разарвала так званую вашынгтонскую згоду 1922 г., якою ўстанаўляліся размеры морскіх узбраенняў вялікіх дзяржаў.

Каб мець вольныя рукі, Японія ў 1932 г. вышла з Лігі нацый. Адначасова ў Японіі выступаюць авантурысцкія клікі імперыялістаў, якія зусім нагла дабіваюцца захвату Уладзівастока, савецкага Сахаліна, савецкай Камчаткі і ўсёй сібірскай тэрыторыі да Байкальскага возера.

У Японіі ўвесь час адкрыта прапаведуюцца ваенна-захватніцкія імкненні. Прывяду такі прыклад: Токійскі карэспандэнт фашысцкай газеты «Берлінер-Тагеблат» паведамляе, што ў кіруючых японскіх колах пастаўлена пытанне аб аўладанні Уладзівастокам. Гэты карэспандэнт цытуе паказальны для настрояў

гэтых японскіх колаў артыкул, змешчаны ў журнале «Кайтсо». Гэты артыкул, як піша токійскі карэспандэнт нямецкай газеты, належыць кіраўніку спраў саюза японскай прамысловасці Акіаме. Вось што ён піша:

«Акіама імкнецца даказаць, што для Японіі з пункту гледжання гаспадарчага, гістарычнага і палітычнага прадстаўляецца надзвычай важным купіць Уладзівасток, совецкія берагавыя правінцыі, паўночную часць Сахаліна і совецкія тэрыторыі, якія мяжуюць з Манчжурыяй. Калі-б такая купля адбылася, то былі-б знішчаны крыніцы будучых канфліктаў паміж Японіяй і СССР. Продаж Уладзівастока Японіі з'яўляецца па думцы Акіамы папярэдняй умовай заключэння паміж Японіяй і Совецкім Саюзам пакту аб ненападзе. Калі-ж становішча на граніцах Манчжурыі і СССР астанецца нязменным, то створацца акалічнасці, якія змогуць уцягнуць у новую вайну не толькі Далёкі Ўсход, але і ўвесь свет».

У артыкуле гаворыцца літаральна наступнае:

«Паміж Сібір'ю і Совецкім узбярэжжам не існуе ні малейшага геалагічнага адзінства, якое сведчыла-б аб тым, што ўзбярэжжа з'яўляецца часцю Манчжурыі.

Продаж Усходне-кітайскай чыгункі дае пабуджальныя падставы для трансакцыі гэтага роду. Усходне-кітайская чыгунка звязвае Сібір праз Манчжурыю найкарацейшым шляхам з Уладзівастокам, у той час калі совецка-манчжурская[1] чыгунка, якая мае той-жа канечны пункт, робіць большы круг. З продажам Усходне-кітайскай чыгункі Уладзівасток астаецца ізаляваным ў стратэгічным і гаспадарчым становішчах».

Як бачыце, Акіама знаходзіць адзіны выхад—СССР павінен адмовіцца ад сваіх правоў на Прымор'е, Амурскую вобласць і Сахалін у карысць Японіі і ад кантынентальных абласцей далёкага Ўсхода ў карысць Манчжурыі. Японія можа ўплаціць за ўсе гэтыя тэрыторыі ўзнагароду ў суме 1 400 млн. іен.

У Еўропе нямецкі фашызм вядзе барацьбу за расшырэнне граніц «трэцяй імперыі» за лік тэрыторый іншых дзяржаў. Асобае месца ў планах нямецкага фашызма займае СССР.

У 1933 г. на лонданскай міжнароднай эканамічнай канферэнцыі прадстаўнік нямецкага ўрада Гугенберг адкрыта выступіў з патрабаваннем прадаставіць Германіі для вольнай эксплаатацыі землі, якія знаходзяцца на ўсходзе Еўропы—гэта значыць у СССР.

Вядома, што даволі аўтарытэтныя дзеячы нямецкай нацыянал-фашысцкай партыі неаднаразова ізлагалі свае «астраумныя» планы перабудовы Ўсходняй Еўропы і абасноўвалі гэтыя планы на праектах адрыву ад СССР Украіны, Каўказа, Крыма і г. д.

---

[1] Акіама мабыць мае на ўвазе Усурыйскую чы гунку.

Як усім ужо вядома, барацьба супроць СССР з'яўляецца самай улюбёнай тэмай, на якой вельмі ахвотна спыняюцца кіраўнікі нямецкага фашызма. Іх «культпропы»—Розенберг, Герынг, Гебельс і інш.—пры ўсякіх выпадках адкрыта заклікаюць увесь капіталістычны свет падтрымаць фашысцкую Германію ў барацьбе супроць комунізма—супроць СССР. Яны згодны паабяцаць Францыі, Англіі і інш. капіталістычным дзяржавам усё што ўгодна для таго, каб урэзоніць іх у неабходнасці падтрымання Германіі ў справе ліквідацыі ачага сусветнага комунізма. У той-жа час нямецкі фашызм не абмяжоўвае сваіх захватніцкіх надзей толькі адным СССР. Нямецкі фашызм не сароміцца адкрыта развіваць пагрозу дзяржаўнай незалежнасці Літвы, Латвіі і Эстоніі, г. зн. тых дзяржаў, якія, па сцвярджэнню тэарэтыкаў нямецкага нацыянал-соцыялізма, павінны ў першую чаргу стаць полем дзейнасці фашысцкай Германіі. У той-жа час нямецкі фашызм падрыхтоўвае далучэнне Аўстрыі, раздзяленне Чэха-Славакіі і Румыніі і ў якасці задачы другой чаргі ён рыхтуецца да разгрому Францыі, да перадзелу каланіяльных здабыч і да ўстанаўлення свайго сусветнага панавання.

У лістападзе 1932 г., кіруючыся ўказанымі імкненнямі, Германія вышла з Лігі нацый і пакінула тым самым канферэнцыю па раззбраенню. Адначасова Германія пачала дзікую гонку ўзбраенняў. Хоць мірныя дагаворы і забараняюць Германіі вырабляць ваеннае снаражэнне—танкі, гарматы, ваенныя самалёты, але нямецкая ваенная прамысловасць працуе па вытворчасці гэтых узбраенняў да адказу.

У Германіі пабудаваны новыя авіяцыйныя заводы, цэлы рад прадпрыемстваў перайшоў выключна на вытворчасць розных відаў узбраенняў. Так абстаіць справа, таварышы, з двума ваяўнічымі імперыялістычнымі дзяржавамі: Японіяй і Германіяй; як бачыце, абедзве разлічваюць на тое, каб пажывіцца за кошт СССР.

Некалькі іншае становішча і палітыку мы маем з боку Францыі.

Непасрэдная пагроза з боку нямецкага фашызма большасці дзяржаў Цэнтральнай Еўропы прывяла да таго, што многія з гэтых дзяржаў вымушаны былі перагледзець сваю палітыку і вырашыць ці выгадна ім у сучасных умовах вайна за новае размежаванне сусветнай геаграфічнай карты.

Францыя напалохана імкненнем нямецкай буржуазіі да рэвізіі Версальскага дагавору і фактычным ростам узброеных сіл Германіі. Францыя добра сабе ўяўляе, што ажыццяўленне Германіяй сваёй знешняй палітычнай праграмы, якая ўключае заваяванне Балтыйскіх дзяржаў, далучэнне Аўстрыі да Германіі, адрыў Славакіі ад Чэха-Славакіі, азначалі-б канец усім пазіцыям, з такім цяжкім трудам адваяваным Францыяй за апошнія 20 год, і звядзенне Францыі да становішча залежнай дзяржавы.

Вось дзе асноўная прычына знешне-палітычнага характару, якая прымусіла Францыю стаць на шлях адмовы ад вайны і захавання міру, на шлях збліжэння з Совецкім Саюзам, як дзяржавай магутнай і ў эканамічных, і ў ваенных адносінах, і як з дзяржавай, добрасумленна праводзячай палітыку міру.

Вось крыніцы совецка-французскага збліжэння і агульнасці пунктаў гледжання па некаторых важных пытаннях міжнародных адносін.

Рад краін Малой Антанты, як Чэха-Славакія, Румынія, Юга-Славія таксама і Балтыйскія дзяржавы, якія знаходзяцца пад пагрозай германскага фашызма, зацікаўлены ў захаванні існуючага становішча.

Некаторым з іх пагражае калі не поўнае тэрытарыяльнае зніштажэнне як самастойных дзяржаў, то ва ўсякім разе іх раздрабленне.

Англійская буржуазія спачувальна адносіцца да процісовецкіх планаў японскага і германскага імперыялізма. Яна-б з ахвотай накіравала ўзброеную небяспеку, якая пагражае міру з боку Германіі і Японіі ў напрамку да Совецкага Саюза. Англійскія імперыялісты, вядома, не пярэчылі-б супроць таго, каб германскі фашызм задаволіў сваю прагнасць да захватаў за кошт СССР. Яны ахвотна далі-б магчымасць нямецкаму фашызму ўзбройвацца, калі-б толькі мелі ўпэўненасць у тым, што нямецкія ўзброенні будуць накіраваны толькі супроць большэвікоў. Але такой упэўненасці ў англійскіх імперыялістаў няма і не можа быць, бо паветраныя ўзброеныя сілы фашысцкай Германіі прадстаўляюць не меншую небяспеку для Англіі, чым для іншых дзяржаў Еўропы, бо ваенны паветраны флот, які ліхманкава будуецца фашыстамі, можа падвергнуць небяспецы Лондан і інш. жыццёвыя цэнтры Велікабрытаніі.

Таму кіруючыя ў Англіі колы не могуць скрыць апасенняў, якія ім унушаюцца бурным ростам нямецкіх узброенняў. Іменна таму англійская буржуазія зацікаўлена ў згодзе з Францыяй для проціпастаўлення агульнага фронта фашысцкай Германіі.

Што датычыць Італіі, то ў апошнія месяцы яна крута змяніла свой напрамак палітыкі. Да апошняга часу Італія выступала за падтрыманне патрабаванняў перагляду Версальскага дагавору.

Італія разлічвала, апіраючыся на падтрыманне Германіі, дабіцца перадзелу калоній і перагляду граніц у сваіх інтарэсах. Спроба захвату Аўстрыі з боку фашысцкай Германіі, забойства ў канцы ліпеня 1934 г. у Вене аўстрыйскага канцлера Дольфуса— прымусілі прызадумацца і фашысцкую Італію.

Італьянцы безумоўна спалохаліся, каб далучэнне Аўстрыі да Германіі не паставіла на паўночнай граніцы Італіі ваяўнічы нямецкі фашызм з яго імперыялістычнымі імкненнямі на Балканы і на бліжэйшы ўсход. Фашысцкая Італія мае ўсе падставы апасацца таксама і таго, што нямецкі фашызм, дабіваючыся паглынання Аўстрыі, выставіць следам за гэтым патрабаванні далу-

чэння да Германіі часці паўднёвага Тіроля, якая адышла да Італіі пасля Версальскага дагавору.

Італія імкнецца папярэдзіць гэтую небяспеку шляхам заключэння згоды з Францыяй, што відна з таго, што нядаўна Лаваль ездзіў у Рым, дзе заключылі згоду з Муссаліні і т. д.

Безумоўна, германская небяспека не з'яўляецца адзінай ваеннай небяспекай у Еўропе. У апошнія гады абвастрыліся італа-югаслаўскія супярэчнасці, венгерска-югаслаўскія і рад іншых супярэчнасцей у Еўропе.

У Еўропе ёсць таксама нямала авантурысцкіх клік, якія імкнуцца любой цаной запаліць пажар сусветнай вайны. Гэтыя авантурысцкія клікі не спыняюцца ні перад чым, у тым ліку і перад тэрарыстычнымі актамі, накіраванымі супроць кіраўнікоў паасобных дзяржаў і кіруючых дзяржаўных дзеячоў.

У 1934 г. дастаткова было такіх фактаў. Варта ўспомніць забойства ў Бухарэсце фашысцкай арганізацыяй «жалезная гвардзія» старшыні совета міністраў Дука, забойства аўстрыйскага канцлера Дольфуса, забойства ў кастрычніку мінулага года ў Марселі югаслаўскага караля і французскага міністра замежных спраў Барту і прапаганду і арганізацыю з іх боку тэрарыстычных актаў на кіраўнікоў Совецкага Саюза, дзе яны звязваюцца з падонкамі контррэвалюцыйнай зіноўеўшчыны і г. д

Велізарная небяспека заключаецца ў тым, што банды міжнародных тэрарыстаў маюць падтрыманне з боку ўрадаў некаторых капіталістычных дзяржаў, якія зацікаўлены ўнесці замяшанне ў міжнароднае становішча, каб шляхам ваеннай правакацыі і забойстваў дамагацца змянення існуючага зараз становішча.

## 2. Поспехі СССР у барацьбе за палітыку міру і рост уплыву СССР у міжнародных адносінах

Тав. Сталін у сваім дакладзе на XVII з'ездзе партыі, гаворачы аб міжнародным становішчы СССР, сказаў:

«У абстаноўцы гэтай прадваеннай свістапляскі, ахапіўшай цэлы рад краін, СССР прадаўжаў стаяць за гэтыя гады цвёрда і непахісна на сваіх мірных пазіцыях, ведучы барацьбу з пагрозай вайны, ведучы барацьбу за захаванне міру, ідучы насустрач тым краінам, якія стаяць так ці інакш за захаванне міру, выкрываючы і зрываючы маску з тых, хто падрыхтоўвае, правакуе вайну».

Праводзячы такую палітыку, урад Саюза ССР дабіўся таго, што Совецкі Саюз у агромнай ступені ўмацаваў сваё міжнароднае становішча і аўтарытэт. Велізарны рост гаспадарча-палітычнай і ваеннай магутнасці СССР, ператварыўшы Совецкі Саюз у адну з мацнейшых дзяржаў у свеце, вымушае розныя дзяржавы, зацікаўленыя па тых ці іншых прычынах у захаванні міру, шукаць збліжэння з СССР.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

Рост міжнароднага ўплыву Совецкага Саюза атрымаў сваё выражэнне і ў факце ўступлення СССР у Лігу нацый, якое адбылося ў верасні 1934 г. Уступленне Совецкага Саюза ў Лігу нацый мела месца па запрашэнню 30 дзяржаў, сярод якіх Францыя, Англія, Італія, Чэха-Славакія, Польшча і інш., якія звярнуліся да Совецкага Саюза з заклікам уступіць у Лігу нацый і тым прынесці ёй сваё каштоўнае супрацоўніцтва ў справе падтрымання і арганізацыі міру.

Тыя буржуазныя краіны, якія не зацікаўлены ў новым перадзеле свету, таксама, і тыя краіны, над якімі навісла пагроза ваеннага нападу, сваім зваротам да Совецкага Саюза ставілі сабе мэту ўмацаваць шляхам моцнага падтрымання з боку СССР Лігу нацый.

Уплыў Совецкага Саюза на міжнародныя адносіны сказаўся ў падпісанні (у ліпені 1933 г.) Совецкім Саюзам і радам дзяржаў канвенцыі аб вызначэнні нападаючага боку (вызначэнні агрэсара). У гэтым дагаворы па ініцыятыве Совецкага Саюза было дакладна ўстаноўлена, што нападаючым бокам у міжнародных канфліктах будзе прызнана тая дзяржава, якая накіравала свае сухаземныя, морскія або паветраныя сілы, хоць-бы і без абвяшчэння вайны, на тэрыторыю другой дзяржавы.

Совецкае вызначэнне нападаючага боку, пад якім падпісалася многа дзяржаў (Фінляндыя, Эстонія, Латвія, Літва, Польшча, Румынія, Чэха-Славакія, Юга-Славія, Турцыя, Персія, Афганістан і інш.), вывела буржуазны свет з цяжкага становішча ў тым сэнсе, што дало яркае, выключаючае ўсякія крыватолкі, вызначэнне нападаючага боку.

Грамаднае значэнне ў справе падтрымання міру павінна мець заключэнне пакту аб узаемадапамозе, так званага Ўсходняга пакту, да ідэі якога Совецкі Саюз адносіцца з вялікім спачуваннем.

Вядома ўжо, што ў барацьбе за мір Совецкі Саюз за гады свайго існавання заключыў са сваімі суседзямі рад дагавораў або пактаў аб ненападзе.

У апошнія тры гады 1932—1934 гг. СССР падпісаў дагаворы аб ненападзе: з Фінляндыяй, Эстоніяй, Латвіяй, Польшчай, Францыяй, Італіяй. Яшчэ раней Совецкі Саюз падпісаў дагавор аб ненападзе з Літвой, Германіяй, Турцыяй, Персіяй і Афганістанам. Кожны дагавор аб ненападзе, які заключаўся совецкім урадам з буржуазнымі дзяржавамі, выяўляў сабой вядомае дасягненне ў справе абароны міру, бо гэтымі дагаворамі капіталістычныя дзяржавы бралі на сябе маральны абавязак устрымацца ад нападу на СССР.

На працягу 1934 г. Совецкі Саюз падпісаў з Фінляндыяй, Латвіяй, Літвой і Эстоніяй, а таксама з Польшчай пратаколы аб працягу дагавораў аб ненападзе на 10 год. Аднак, гэтыя дагаворы пры ўсіх сваіх вартасцях маюць тое несавершэнства, што, будучы толькі двухбаковымі, яны залежаць ад волі падпісаўшых бакоў. Адмова аднаго боку ад выканання дагавору, нару-

шэнне яго адным з падпісаўшых бакоў ставіць другі бок перад тварам небяспекі ў нападзе.

Больш верным сродкам у справе аховы міру, асабліва ў сучасных умовах, з'яўляецца шматбаковы дагавор з удзелам раду дзяржаў, якія ўзаемаабавязваюцца ўстрымацца ад нарушэння граніц, якія гатовы ўзаемна садзейнічаць адна другой у справе барацьбы за мір.

Перавагай гэтага шматбаковага дагавору ўзаемадапамогі з'яўляецца калектыўная гарантыя міру, якая ў ім ёсць і якая служыць інтарэсам дзяржаў, зацікаўленых у захаванні міру, з'яўляючыся ў той-жа час перасцярогай усякім падпальшчыкам вайны.

Усходні пакт павінен аб'яднаць СССР і балтыйскія дзяржавы (Фінляндыя, Эстонія, Латвія і Літва), Польшчу, Чэха-Славакію, Германію і Францыю. Усе гэтыя дзяржавы ў інтарэсах лепшай барацьбы за захаванне міру павінны даць абавязацельствы індывідуальна і ўзаемна захоўваць недатыкальнасць зараз існуючых граніц у Еўропе. Усе гэтыя дзяржавы павінны выступіць супроць усялякіх нарушыцеляў міру, ці гэта будзе ўдзельнік пакту ці няўдзельнік.

Усходні пакт разлічан на ўдзел у ім і Германіі на агульных падставах з іншымі дзяржавамі, зацікаўленымі ў гэтым пакце. Пакт толькі хоча папярэдзіць ваенную небяспеку як з боку Германіі, так і любой іншай дзяржавы, адкуль-бы гэтая небяспека ні пагражала.

СССР зацікаўлен ва Усходнім пакце, выступаючы на чале народаў, якія вядуць барацьбу за захаванне міру. Французскі ўрад падтрымлівае гэты пакт, бо і ён стаіць за захаванне мірных адносін у Еўропе. Супроць Усходняга пакту могуць выступаць толькі тыя, хто яўным чынам не зацікаўлен у захаванні міру.

На жаль, супроць пакту мы чулі да гэтага часу пярэчанні з боку Германіі, а таксама і з боку нашай суседкі Польшчы, якая ў апошнія месяцы апынулася зусім у баку ад барацьбы за мір.

Фашысцкая Германія заяўляе, што яна не бачыць для сябе асаблівай выгады ад далучэння да пакту. Яна, моў, не мае патрэбы ні ў гарантыі з боку СССР—яе граніц на Ўсходзе, ні ў гарантыі з боку Францыі—яе граніц на Захадзе.

Германскі фашызм пярэчыць супроць шматбаковых дагавораў, аддаючы перавагу двухбаковым дагаворам. Як быццам фашысцкай Германіі незразумелы перавагі шматбаковага пакту, якія заключаюцца ў калектыўным выступленні ўсіх удзельнікаў гэтага дагавору за кожны бок, які прымкнуў да пакту і які будзе падвергнут нападу. Але іменна таму, што фашысцкая Германія добра разумее перавагу шматбаковага пакту, яна так рашуча выступае супроць яго. Замест Усходняга пакту фашысцкая Германія прапануе Францыі заключыць ваенны саюз дваіх. Германскія фашысты гатовы прадаставіць месца ў гэтым саюзе таксама і Польшчы.

Аднак, зразумела, якія мэты можа праследаваць падобная камбінацыя. Антысовецкае астрыё гэтай камбінацыі вельмі ярка выступае ўперад і ці варта яго растлумачваць? Не цяжка бачыць таксама, што праект германска-французскай згоды, выстаўлены ў процілегласць Усходняму пакту, з'яўляецца лоўкім манеўрам фашысцкай Германіі, якая імкнецца адарваць Францыю ад СССР з тым, каб умацаваць становішча Германіі перад тварам ізаляванай Францыі.

## 3. Узаемаадносіны СССР з паасобнымі капіталістычнымі краінамі

Велізарны рост уплыву СССР на сусветную палітыку сказаўся на ўзаемаадносінах СССР з паасобнымі капіталістычнымі дзяржавамі.

### СССР і Францыя

У першую чаргу варта адзначыць значны крок уперад па шляху франка-савецкага збліжэння, якое аснавана на зацікаўленасці абодвух дзяржаў у захаванні міру і на аб'яднанні вакол барацьбы за мір тых краін, якія ставяць сабе тыя-ж самыя мэты.

Уваплашчэннем франка-савецкага палітычнага супрацоўніцтва з'явілася падпісанне 5-га снежня 1934 г. совецка-французскага пратакола, накіраванага на супрацоўніцтва СССР і Францыі ў барацьбе за ўмацаванне міру шляхам Усходняга пакту, які палепшыў-бы адносіны паміж усімі дзяржавамі ўсходняй Еўропы. Франка-совецкі пратакол з'яўляецца таксама крокам уперад і ў франка-совецкіх адносінах і крокам уперад па ўмацаванню міру, паколькі ён наносіць удар усякім спробам, накіраваным як супроць усеагульнага міру, так і супроць Францыі і СССР.

Праяўленнем імкнення Францыі і СССР прадаўжаць палітыку дружаскага супрацоўніцтва з'яўляецца нядаўні прыезд у СССР французскага міністра гандлю Маршандо і падпісанне совецка-французскай гандлёвай згоды.

Ілюстрацыяй буйнейшых поспехаў мірнай палітыкі СССР за апошнія два гады з'яўляецца прызнанне СССР радам капіталістычных краін свету. У 1934 г. былі ўстаноўлены дыпламатычныя зносіны паміж СССР і Румыніяй, прызнанне СССР з боку Балгарыі, у канцы 1934 г. быў праведзен абмен пасланнікамі паміж СССР і Венгрыяй. Трэба таксама адзначыць, што ў апошні год мы маем заметны зрух у адносінах СССР з Чэха-Славакіяй, з якою ў СССР складаюцца зусім прыязныя адносіны. За апошні час мы маем палепшанне нашых адносін з бліжэйшымі нашымі суседзямі, у першую чаргу з балтыйскімі дзяржавамі.

## СССР і Польшча

Гаворачы пра нашы ўзаемаадносіны з Польшчай, трэба ўспомніць, што ўжо т. Сталін у сваім дакладзе на XVII з'ездзе партыі ў студзені 1934 г. прадбачыў зігзагі і нечаканасці польскай знешняй палітыкі. Зараз, праз год, гэты прагноз т. Сталіна на ўсе сто процантаў пацвердзіўся. Цяпер гэта прызнае нават польскі афіцыёз «Газета польска». Рэдактар гэтай газеты, адзін з віднейшых людзей урадавага лагера, палкоўнік Медзінскі ў навагоднім нумеры газеты піша: «Мы павінны ўстанавіць, што ў апошнія месяцы затармазілася развіццё суседскага зближэння і супрацоўніцтва на міжнароднай арэне паміж Польшчай і Совецкім Саюзам».

Па словах гэтага палкоўніка, прычынай такога тармажэння польскай знешняй палітыкі з'яўляецца выстаўленая Францыяй і СССР ініцыятыва заключэння Ўсходняга пакту. Здавалася-б, што ідэя Ўсходняга пакту павінна была іменна ў Польшчы сустрэць самае гарачае спачуванне. Хіба Польшча можа быць спакойна за свае заходнія граніцы? Хіба пытанне аб звароце Германіі Данцыга і Верхняй Сілезіі не астаецца да гэтага часу важнейшым пунктам праграмы германскага нацыянал-соцыялізма? Гэта-ж так. Але да гэтага часу Польшча не дала сваёй згоды на ўдзел ва Ўсходнім пакце. Услед за Германіяй, Польшча выстаўляе розныя матывы, якія перашкаджаюць далучэнню Польшчы да гэтага пакту. Адным з такіх матываў з'яўляецца тое, што дагавор, які Польшча заключыла з Германіяй у студзені 1934 г., можа ўступіць у супярэчнасць з Ўсходнім пактам.

Якія-ж ёсць супярэчнасці паміж польска-германскай згодай і Ўсходнім пактам?

Калі толькі польска-германскі дагавор трактуе аб міры і аб ненападзе, а не аб іншым, то значыць, што ён цалкам і поўнасцю перакрываецца праектам Усходняга пакту. У чым справа? Польскія дзяржаўныя дзеячы павінны ўзважыць, ці не атрымалі-б яны найлепшую гарантыю сваіх граніц ва Ўсходнім пакце, які павінен аб'яднаць і Францыю, і СССР, і Германію, і Польшчу ў агульнай барацьбе за мір супроць ўсякіх яго нарушальнікаў. Польшча павінна добра задумацца над гэтым пытаннем і рашыць з кім ісці—ці з СССР і Францыяй, якія арганізуюць народы Еўропы на барацьбу за мір, ці з тымі, хто зрывае еўрапейскі мір і навязвае новую імперыялістычную вайну.

Палкоўнік Медзінскі ў сваім артыкуле заяўляе, што «мірнае супрацоўніцтва паміж Польшчай і СССР з'яўляецца адной з галоўнейшых гарантый міру на Ўсходзе».

Следуючы за гэтай мыслю трэба падкрэсліць, што найбольш верную палітыку, найлепшую гарантыю граніц Польшча можа знайсці ва Ўсходнім пакце.

### СССР і Амерыка

Буйнейшай падзеяй у міжнародных адносінах Савецкага Саюза з'яўляецца прызнанне Савецкага Саюза з боку Злучаных Штатаў Амерыкі.

Выступленне японскага імперыялізма супроць Кітая, зрыў згоды паміж ЗША, Англіяй і Японіяй адносна падзелу сферы ўплыву ў Кітаі, апошнія захваты японскага імперыялізма ў Кітаі, нядвухсэнсна накіраваныя супроць ЗША, стварылі пэўную ваенную пагрозу на ўзбярэжжы Тіхага акіяна.

Пагроза японска-амерыканскай вайны і клопаты аб сваім знешнім гандлі прымусілі ЗША пераглядзець сваю пазіцыю ў адносінах да СССР. У лістападзе 1933 г. ЗША прызнаюць СССР «дэ-юрэ». Гэты факт мае вялікае міжнароднае значэнне, і ён, зразумела, не можа не адбіцца на становішчы на Далёкім Усходзе.

### СССР і Японія

На далёкім Усходзе Савецкі Саюз за апошнія гады даў многа доказаў сваёй рашучасці адстойваць усімі сродкамі справу міру і недатыкальнасць нашых граніц. Выражэннем мірных імкненняў Савецкага Саюза на Далёкім Усходзе з'яўляюцца паспяхова прасунуўшыяся ў апошнія месяцы перагаворы аб продажы КУЧ.

Аднак на далёкім Усходзе з боку груповак імперыялістычнай японскай буржуазіі, маючых значны ўплыў, мы чуем галасы, якія гучаць адкрытай пагрозай тэрыторыям СССР. Вось чаму даючы ўсім доказ мірных імкненняў, мы абавязаны быць напагатове. Мы павінны быць гатовы, каб аградзіць нашу дзяржаву ад усякіх нечаканасцей.

Знешняя палітыка Савецкага Саюза атрымала вычарпальнае выражэнне ў словах нашага правадыра т. Сталіна, які сказаў на XVII партыйным з'ездзе:

> **«Хто хоча міру і дабіваецца дзелавых сувязей з намі, той заўсёды знойдзе ў нас падтрыманне. А тыя, якія папрабуюць напасці на нашу краіну,—атрымаюць сакрушальны адпор, каб надалей не павадна было ім соваць сваё свіное рыла ў наш савецкі гарод».**

Вось, у агульных рысах, як абстаіць справа з міжнародным становішчам.

## 4. Аб ваеннай небяспецы і задачах умацавання абараназдольнасці СССР

З таго, што я сказаў вышэй, яскрава відаць, што ваенная небяспека стаіць перад намі ва ўвесь свой рост. Мы бачым шалёную падрыхтоўку з боку капіталістычных краін да вайны, як сродак, які, па іх думцы, вывядзе капіталізм з крызіса.



ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Асабліва гэтая небяспека пагражае з боку фашысцкай Германіі і Японіі, якія імкнуцца скалаціць паміж сабой ваенны саюз. Невыпадкова і тая з'ява, што як Японія, так і Германія аднačасова выйшлі з Лігі нацый. Аб гэтым адкрыта і цяпер пішуць у японскім журнале «Кайтсо» японскія імперыялісты, накшталт Акіама, аб чым я ўказваў вышэй.

Прагноз, даны тав. Сталіным на XVII з'ездзе ВКП(б) аб пошуках капіталізмам выхаду з крызіса і пераадалення яго шляхам вайны, астаецца цалкам у поўнай сваёй сіле і з'яўляецца для нас асноўным указаннем у далейшай рабоце па ўзмацненню абароназдольнасці нашай краіны.

Нямецкі фашызм ужо не лічыць магчымым і патрэбным хаваць сваё ўзбраенне і падрыхтоўку да вайны. Як Японія, так і Германія імкнуцца да ажыццяўлення сваіх імперыялістычных захватніцкіх мэт, дамагаюцца вырашыць асноўнае для іх цяпер пытанне—запалучэнне сабе саюзнікаў.

Наш Совецкі ўрад Саюза праводзіць няўхільную палітыку міру. Мы гэтую палітыку міру падмацоўваем рэальнай падставай—узмацняем нашу абароназдольнасць, узмацняем боездольнасць Чырвонай арміі. Гэтую задачу мы не пакідалі і не павінны пакідаць ні на адну мінуту.

Тав. Сталін, падводзячы вынікі выканання першай пяцігодкі ў чатыры гады на аб'яднаным пленуме ЦК і ЦКК ВКП(б) 7 студзеня 1933 г., сказаў нам, што мы ў выніку паспяховага выканання першай пяцігодкі ператварылі СССР з краіны слабай і непадрыхтаванай да абароны ў краіну магутную ў справе абароназдольнасці, у краіну, гатовую да ўсякіх выпадковасцей, у краіну, якая можа вырабляць у масавым маштабе ўсе сучасныя прылады абароны і забяспечыць імі сваю армію ў выпадку нападу на нас.

Пры наяўнасці імкненняў з боку імперыялістаў запаліць вайну і пажывіцца за кошт нашага Саюза, мы даўно маглі-б падвергнуцца нападу з іх боку, калі-б наша вялікая дзяржава не расла ў эканамічных і ваенных адносінах.

Наша партыя і совецкі ўрад, праводзячы палітыку індустрыялізацыі і пераробкі сельскай гаспадаркі на калгасны лад, ні на адну мінуту не забылі аб задачах умацавання абароназдольнасці нашай краіны і боездольнасці нашай Чырвонай арміі, бо гэта ёсць самая верная гарантыя нашага мірнага соцыялістычнага будаўніцтва. І ў гэтым мы дасягнулі вялікіх поспехаў.

Магутнасць нашай краіны і боездольнасць Чырвонай арміі цяпер не адмаўляюць і нашы ворагі. Толькі таму, што мы магутны, яны і не напалі на нас дагэтуль. Буржуазныя палітыкі і ваякі капіталізма вымушаны лічыцца з боездольнасцю нашай Чырвонай арміі—гэта відаць з цэлага раду выказванняў як ваенных спецыялістаў капіталістычных краін, так і іншых дзеячоў капіталізма.

Прывяду пару вытрымак зарубежнага друку аб Чырвонай арміі.

Рэдактар «Эко-дэ-пары»—органа французскага генеральнага штаба—змясціў рад артыкулаў аб Чырвонай арміі аднаго з сваіх рэдактараў, Кірыліса, які пабываў у СССР. Кірыліс асабліва захапляюча адзываецца аб совецкай авіяцыі. Ён заяўляе, што совецкая авіяцыя «з'яўляецца трыумфам большэвікоў».

Далей ён піша:

«Рускія на некалькі год абагналі нас у авіяцыі ва ўсіх катэгорыях: істрэбіцельнай, бомбардыровачнай, распазнавальнай, ва ўсіх дэталях абсталявання і інструментовак. Яны нас далёка апярэдзілі».

Свой артыкул аб авіяцыі ён канчае наступным:

«Совецкая авіяцыя прадстаўляе для Захада найзначнейшую сілу, здольную адыграць рашаючую ролю».

Амерыканскі ваенны журналіст Лінтон Уэльс, які нядаўна вярнуўся з Далёкага Ўсхода, змясціў у французскай газеце «Энтрансіжэн» артыкул аб магчымым выніку будучай японасовецкай вайны. Ён піша, што ў выпадку нападу японцаў на Владзівасток,

«... Советы не будуць бяздзейнічаць і іх 700 аэрапланаў, сканцэнтраваных за Чытой, скажуць сваё слова... Задача будзе заключацца ў тым, каб нанесці як мага большы ўрон морскаму і паветранаму флоту Японіі, а таксама ў арганізацыі налётаў на Токіо, Асаку і Кобэ, пры дапамозе паветраных знарадаў і газаў; апрача гэтага рускія будуць імкнуцца паралізаваць галоўныя прамысловыя цэнтры варожых краін».

Лінтон Уэльс упэўнен, што

«... Совецкія контратакі на Японію ўпаўне ажыццявімы, дзякуючы вялікаму радыусу дзейнасці рускіх бомбавозаў. Нават пры ўмове максімальнай іх нагрузкі яны здольны зрабіць палёт туды і назад».

Уэльс лічыць, што ў паветранай вайне ўсе шансы на баку СССР.

«... У якіх-бы пунктах Японія не атакавала рускіх, я ўпэўнен,—піша Уэльс,—на падставе майго працяглага вопыту ваеннага карэспандэнта, што яны (японцы) раскаюцца хутка, упэўніўшыся ў тым, што «схапілі тыгра за хвост»».

Яшчэ шмат што пішуць пра нас і пішуць цвяроза. Аб гэтым можна чытаць у прэсе любой буржуазнай краіны.

Цікава прывесці разважанне аднаго нямецкага генерала Кохенгаузена, які з'яўляецца старшынёй «таварыства ваенных

палітыкаў». Ён змясціў артыкул у журнале «Ост-Еўропа» аб Чырвонай арміі, які ён так заканчвае:

«Увага, панове афіцэры буржуазных краін Еўропы! Чырвоная армія з'яўляецца грозным праціўнікам. Чырвоная армія знаходзіцца ў найлепшых умовах, бліскуча абвучана і прадстаўляе магутную сілу».

Карысна будзе прывесці і водзыў італьянскага генерала Грацыолі, які быў у Саюзе летам мінулага года і прысутнічаў на вучэннях Беларускай ваеннай акругі тут, у Менску.

Пасля звароту ў Рым ён напісаў у сваіх газетах даволі падрабязна аб тым, што бачыў тут у нас. А гэты генерал, па сведчанню французскай газеты «Тан», якая перадрукавала яго артыкулы, з'яўляецца «адным з найбольш відных ваенных дзеячоў фашысцкай Італіі, бо іменна яму Мусаліні даверыў ажыццявіць сваю канцэпцыю аб узбраенні нацыі і выканаць задачу—арганізаваць ваеннае выхаванне і падрыхтоўку ўсяго італьянскага насельніцтва і кіраваць гэтай справай».

Генерал Грацыолі з усёй цвярозасцю гаворыць аб боездольнасці нашай Чырвонай арміі, асабліва аб саставе чырвонаармейцаў і камандзіраў, аддаючы ў той-жа час і належнае месца ўзбраенням і тэхніцы Чырвонай арміі.

Генерал Грацыолі ў сваёй характарыстыцы асаблівае месца ўдзяліў палітычнай арганізаванасці Чырвонай арміі. Ён піша: «Сярод выключных фактараў, з якіх Чырвоная армія атрымала карысць, першае месца займае рэвалюцыя, утварыўшая дзейнічаючы рэвалюцыйны дух накшталт духу, які быў уласцівы кіраўнікам арміі Напалеона».

Нам, таварышы, цікава ведаць думку з лагера нашых праціўнікаў аб нашай абароназдольнасці. Думкі, як бачыце, для нас прыемныя, але мы не павінны супакойвацца на поспехах. Нам нельга ні на адну мінуту забываць, што ў любы час вораг можа на нас напасці, што мы павінны быць заўсёды гатовы.

Асабліва гэта важна ў нас, у БССР, як прыгранічнай рэспубліцы, бо мы жывем і працуем на граніцы з капіталістычным Захадам. Таму наша задача заключаецца ў тым, каб удзесяцёрыць нашу энергію па ўзмацаванню абароназдольнасці нашай краіны, аказваць усямернае садзейнічанне Чырвонай арміі ў яе вучобе, у аўладанні тэхнікай вайсковай справы, памагаць у справе далейшага палепшання бытавых умоў Чырвонай арміі; усямерна ўзмацняць работу Асоавіяхіма, Аўтадора, асабліва сярод моладзі і ў калгасах, дзе яна яшчэ пастаўлена нездавальняюча, акружыць увагай і любоўю нашых чырвонаармейцаў. Наша армія прынцыпова адрозніваецца ад армій іншых краін, бо яна ёсць адзіная армія ў свеце, якая не імкнецца да вайны, а адстойвае мір, моцна стаіць на варце совецкіх граніц і актыўна прымае ўдзел у будаўніцтве соцыялізма.

Мы, прыгранічная рэспубліка, працуем і будуем соцыялізм на рубяжы з капіталістычным светам. Мы павінны як зяніцу вока берагчы совецкія граніцы. Уся Совецкая Беларусь павінна і будзе стаяць зорка на варце совецкіх граніц. (Апладысменты.)

Вось, таварышы, агульнае становішча міжнароднай палітыкі і нашы задачы па ўмацаванню абароназдольнасці краіны.

Пераходжу да другой часткі свайго даклада.

## I. ВЫНІКІ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА ПА СССР І ПА БССР АД З'ЕЗДА ДА З'ЕЗДА

### 1. Асноўныя вынікі соцыялістычнага будаўніцтва па СССР

Наша краіна падыходзіць да свайго з'езду советаў з гіганцкімі перамогамі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. СССР з года ў год расце і ўзмацняецца, як магутнейшая індустрыяльная краіна свету, з гігантамі соцыялістычнай індустрыі, з высокай тэхнікай.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Прывяду некаторыя асноўныя факты дасягненняў нашага вялікага СССР за апошнія гады. Калі я ў папярэдняй часці свайго даклада аб міжнародным становішчы паказаў заняпад капіталістычнай эканомікі, абнішчанне працоўных мас краін капіталізма, то зараз вы ўбачыце лічбы вялікага росту СССР, вялікага матэрыяльнага і культурнага ўздыму найшырэйшых мас працоўных СССР.

Вось прыклады. Народны даход у Совецкім Союзе за 4 гады гіганцка вырас і выглядае так:

У 1932 г. народны даход складаў 45,5 мард. руб.
„ 1933 г. „ „ „ 50,1 „ „
„ 1934 г. „ „ „ 60,2 „ „

Асноўныя фонды соцсектара народнай гаспадаркі:

У 1930 г. раўняліся 59 903 млн. руб.
„ 1932 г. „ 71 870 „ „
„ 1933 г. „ 85 222 „ „
„ 1934 г. „ 99 188 „ „

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы